Источник: "Бібліятэчны свет" - 2013-06-28, №3



**Таццяна Захарава**

**Загадчык сектара НДА кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# КНІЖНАЯ СПАДЧЫНА РАДЗІВІЛАЎ




12 красавіка ў Нясвіжскім палацавым ансамблі адбылося адкрыццё выстаўкі «Кніжная спадчына Радзівілаў». Гэта сумесны праект Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» (музей-запаведнік), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі).

Гісторыя фарміравання Нясвіжскай ардынацкай бібліятэкі бярэ пачатак з XVI ст. Сёння разрозненыя яе часткі знаходзяцца ў бібліятэках Расіі, Фінляндыі, Польшчы, Літвы і Беларусі. Таму выстаўка «Кніжная спадчына Радзівілаў» дала грамадскасці сапраўды ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з асобнікамі кніг са славутага беларускага прыватнага збору. Сімвалічна, што ўпершыню пасля доўгага перапынку частка калекцыі вярнулася, хоць і кароткачасова, ў родныя сцены Нясвіжскага замка.

90 каштоўных кніжных помнікаў у экспазіцыю прадаставілі НББ і ЦНБ НАН Беларусі, якія з’яўляюцца захавальніцамі часткі дакументальнай спадчыны Радзівілаў. У 2009 г. Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) было прынята рашэнне аб уключэнні архіваў Радзівілаў і Нясвіжскай калекцыі кніг у Сусветны Рэгістр «Памяць свету».

На мерапрыемстве выступілі дырэктар музея-запаведніка С.М. Клімаў, дырэктар НББ Р.С. Матульскі, дырэктар ЦНБ НАН Беларусі Н.Ю. Бярозкіна, старшыня Беларускага фонду культуры У.А. Гілеп, заслужаны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік творчага калектыву «Беларуская Капэла» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь В.І. Скарабагатаў.

Урачыстае адкрыццё выставы на правах гаспадара распачаў Сяргей Міхайлавіч Клімаў. Ён сардэчна прывітаў гасцей імпрэзы, падзякаваў партнёраў – арганізатараў мерапрыемства і запэўніў прысутных, што і надалей у экс-рэзідэнцыі «некаранаваных каралёў» Радзівілаў будуць рэалізоўвацца цікавыя сумесныя праекты.

Наступны выступоўца Раман Сцяпанавіч Матульскі распавёў аб гістарычным значэнні і ролі Нясвіжскай бібліятэкі, аб унёску НББ у даследаванне ўнікальнага кніжнага збору Радзівілаў. Прысутныя даведаліся, што сёння ў НББ захоўваецца 669 старадрукаў (выданняў XVI–XVIII стст.) і рэдкіх выданняў XIX ст., 5 рукапісаў, 2 архіўных дакументы фотаальбомы і 1 перыядычнае выданне са знакамітага збору. Электронная бібліятэка НББ уключае тэматычную калекцыю «Radziviliana», дзе прадстаўлены дакументы з бібліятэкі Радзівілаў і пра Радзівілаў. У канцы 2005 г. пры падтрымцы ЮНЕСКА з удзелам супрацоўнікаў НББ і калег з ЦНБ НАН Беларусі быў падрыхтаваны мультымедыйны CD-Rom «Нясвіж – культурны цэнтр Еўропы і нацыянальны помнік», дзе акрамя гістарычнай і мастацкай спадчыны рода былі прадстаўлены архіўныя і бібліятэчныя калекцыі. Вынікамі навуковай і выдавецкай дзейнасці НББ з’яўляюцца два CD-ROMы:

1. «Творы прадстаўнікоў роду Радзівілаў», які ўключае паўнатэкставыя копіі старадрукаў XVII–XVIII стст., «Камедыі і трагедыі» Уршулі Радзівіл і чатыры выданні на розных мовах «Перэгрынацыі» Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі з навуковым каментарыем Г. Галенчанкі (2009);

2. «Radziviliana: іканаграфія Радзівілаў: дакументальныя помнікі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», які ўключае паўнатэкставую электронную копію альбома гравюр выдання 1875 г. з партрэтамі прадстаўнікоў роду Радзівілаў «Icones Familiae Ducalis Radivilianae» з навуковым каментарыем В. Бажэнавай (2010).

Раман Сцяпанавіч Матульскі падкрэсліў, што ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. НББ працягвае актыўную работу па вывучэнні і віртуальнай рэканструкцыі ўнікальнага кніжнага збору Радзівілаў.

У сваім выступленні Наталля Юр’еўна Бярозкіна акрэсліла гісторыю і лёс Радзівілаўскага збору, частка якога (амаль 3,5 тысяч адзінак) сёння захоўваецца ў ЦНБ НАН Беларусі і з’яўляецца адной з самых каштоўных калекцый бібліятэкі. Дырэктар акцэнтавала ўвагу на даследаваннях, якія з 2005 г. вядуцца ў ЦНБ НАН Беларусі на тэму «Бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у фондах ЦНБ НАН Беларусі: вывучэнне складу і навуковае апісанне дакументаў» і маюць свой плённы вынік у выглядзе навуковых выданняў. З 2010 г. распачаўся выпуск серыі каталогаў, мэта якой – адлюстраваць склад некалі буйнейшай прыватнай бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў XV– першай паловы XX стст. Першы каталог быў выдадзены ў 2010 г. У яго ўключана 27 дакументаў XV–XVI стст. Другі пабачыў свет у 2012 г. (утрымлівае 139 дакументаў XVII ст.). Плануецца выпуск трэцяга каталога, які будзе складацца з чатырох частак і прадставіць каля 1000 дакументаў. Наталля Юр’еўна падкрэсліла, што бібліятэкі з’яўляюцца ўстановамі, дзе адбываецца навуковае вывучэнне кніжных помнікаў і дзе створаны добрыя ўмовы для працы даследчыкаў з іншых устаноў і краін.

Уладзімір Аляксандравіч Гілеп павіншаваў арганізатараў і ўдзельнікаў мерапрыемства з гістарычнай падзеяй – вяртаннем, хоць і кароткачасовым, часткі кніжнага збору ў Нясвіж, а таксама выказаў надзею на папаўненне фондаў музея аўтэнтычнымі прадметамі, звязанымі з культурай знакамітага роду.

Даўні сябар музея Віктар Іванавіч Скарабагатаў падараваў у фонды музея-запаведніка нотныя выданні твораў кампазітараў эпохі Радзівілаў і CD-ROM з запісам араторыі «Жальбы» Ігара Хадоскі, створанай паводле жалобных галашэнняў XVII–XVIII стст. Араторыя гучала 2 гады таму ў Нясвіжскім касцёле Божага Цела ў рамках правядзення вечароў Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь у Нясвіжскім замку.

Напрыканцы цырымоніі адкрыцця выстаўкі загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі А.В. Стэфановіч прэзентаваў каталог «Бібліятэка Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі». Каталог уяўляе сабой поўнае апісанне выданняў XVII ст. з кніжных збораў Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў з фондаў ЦНБ НАН Беларусі.

Пасля ўрачыстага адкрыцця ўдзельнікі імпрэзы перайшлі да непасрэднага агляду экспазіцыі, у склад якой увайшлі кнігі па гісторыі, праве, тэалогіі, філасофіі, прыродазнаўчых навуках, літаратуры, выданні Нясвіжскай друкарні XVIII ст., творы Радзівілаў і пра Радзівілаў. Найбольш аб'ёмна была прадстаўлена гістарычная літаратура, дарэчы аддзел гісторыі ў Нясвіжскім зборы, згодна вопісаў, быў самы вялікі. Сярод экспанатаў знаходзіліся лацінамоўнае выданне першага поўнага курса гісторыі Польшчы Марціна Кромера «De origine et rebus gestis Polonorum» (1568), славутыя хронікі Мацея Стрыйкоўскага «Kronika polska» (1582) і Аляксандра Гваньіні «Kronika Sarmacyey Europskiey» (1611), польскі пераклад гісторыі Расіі Мікалая Карамзіна «Historya panstwa rossyiskiego» (1825).

Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікалі выданні Нясвіжскай друкарні XVIII ст., творы саміх Радзівілаў, а таксама пра славуты магнацкі род. Сярод іх апісанне падарожжа ў Святую зямлю князя Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі «Пэрэгрынацыя», прадстаўленае ў некалькіх выданнях на польскай (1607, 1628, 1745) і рускай (1787) мовах, а таксама знакамітыя альбомы з партрэтамі прадстаўнікоў роду «Icones Familiae Ducalis Radivilianae» (1875) і «Galerja Nieswiezska portretow Radziwillowskich» (1857) Эдварда Катлубая. Экспазіцыя выставы была дапоўнена партрэтамі Радзівілаў з фондаў Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж».

P.S. За час працы з 12 красавіка па 12 мая выставу наведала больш за 800 чалавек.

**Summary**

The publication provides information on the opening ceremony of the book exhibition “Radziwill's Book Heritage” in the Nesvizh palace ensemble.

Таццяна Захарава. Кніжная спадчына Радзівілаў